# ЭТНАПЕДАГАГІЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ

***І.С. Сычова***
*УА МДПУ імя І.П. Шамякіна*
*г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь*

*Артыкул прысвечаны аналізу зместу этнапедагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў у працэсе вывучэння курсаў і спецкурсаў па этнапедагогіцы, што дазволіць сфарміраваць светапогляд будучага педагога, здольнасць выкарыстоўваць патэнцыял традыцыйнай культуры беларусаў і іншых народаў свету пры рабоце па выбранай спецыяльнасці.*

*Ключавыя словы: этнапедагогіка; беларуская народная педагогіка; этнапедагагічная падрыхтоўка студэнтаў; традыцыйная культура беларусаў; духоўная культура беларусаў; матэрыяльная культура беларусаў.*

Студэнты педагагічных вну і педагагічных спецыяльнасцей вну Рэспублікі Беларусь вывучаюць курсы па этнапедагогіцы, беларускай народнай педагогіцы. У 2012 годзе ва УА БДПУ імя М. Танка распрацавана тыповая вучэбная праграма “Народная педагогіка беларусаў” для студэнтаў, якія навучаюцца па спецыяльнасцях профілю А “Педагогіка” [1]. Ва УА МДПУ ім. І.П. Шамякіна кандыдатам педагагічных навук, дацэнтам Болбасам В.С. выкладаюцца наступныя курсы: “Этнапедагогіка” для студэнтаў, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-86 01 01-01 – “Сацыяльная работа (сацыяльна-педагагічная дейнасць”) і “Народная педагогіка” для магістрантаў, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-08-80-06 – “Агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі”. Пры вывучэнні названых курсаў студэнты і магістранты даведваюцца аб гісторыі ўзнікнення і вывучэння народнай педагагічнай культуры, аналізуюць асноўныя выхаваўчыя ідэі, прынцыпы, метады і сродкі этнічнай педагогікі, выяўляюць спецыфіку арганізацыі маральнага, разумовага, фізічнага, эстэтычнага выхавання з улікам развіцця канкрэтнага этнасу, абагульняюць накірункі выкарыстання этнапедагагічных ідэй у сучаснасці.

Пры гэтым, улічваючы даволі істотныя разыходжанні паміж традыцыйнай і сучаснай культурамі, існуе пэўны скептыцызм у разуменні неабходнасці этнапедагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў розных педагагічных спецыяльнасцей і спецыялізацый, прама ці ўскосна ўзнікае пытанне: што можа даць вывучэнне этнапедагогікі як агульнай дысцыпліны аб выхаваўчых традыцыях народаў свету або беларускай народнай педагогікі, якая скіравана на вывучэнне выхаваўчых традыцый канкрэтнага этнасу, будучым спецыялістам у галіне дашкольнай адукацыі,



МГПУ им. И.П.Шамякина

фізічнай культуры, прафесійнага навучання, сацыяльнай абароны, гуманітарных і прыродазнаучых навук? Сучасныя расійскія даследчыкі таксама адзначаюць сацыяльную апатыю, нігілізм у адносінах да народнай культуры і выхаваўчых традыцый ва ўмовах грамадскага крызісу, у выніку чаго губляюцца спрадвечныя ідэалы, маральна-этычныя паняцці, духоўныя каштоўнасці і стэрэатыпы паводзін [3, с. 3–4].

Па-першае, гэта разгляд агульнапедагагічных пытанняў, вызначэнне прынцыпаў, метадаў і сродкаў народнага выхавання, пытанняў развіцця і фарміравання асобы, эфектыўнай арганізацыі працоўнага і фізічнага, маральнага і эстэтычнага выхавання моладзі, што актуальна ва ўсе часы.

Па-другое, гэта работа непасрэдна са зместам традыцыйнай народнай культуры, якую можна падзяліць на матэрыяльную і духоўную, сістэматызаваць і адабраць найбольш істотнае ў залежнасці ад напрамку прафесійнай падрыхтоўкі студэнта. Пры гэтым неабходна ўлічваць, што такая дыферэнцыяцыя з’яўляецца даволі ўмоўнай, бо, адпаведна народным уяўленням, атрымаць плён у працы немагчыма без добрай песні (жніўнай, касецкай, палольнай, ягаднай), а сапраўдны майстар (каваль, ганчар, млынар, цясляр) ведае не толькі сакрэты рамяства, але і падпарадкоўвае сабе стыхіі прыроды (вада, паветра, агонь, дрэва), слова ж у народнай творчасці мае не толькі лексічнае, але і сакральнае, у тым ліку і выхаваўчае значэнне.

Па-трэцяе, студэнту любой спецыяльнасці як будучаму выхавальніку, патэнцыяльнаму класнаму кіраўніку будуць карыснымі абмеркаванне педагагічных сітуацый з улікам вопыту народнай педагогікі; вывучэнне і сумеснае з вучнямі і бацькамі адзначэнне народных святаў; правядзенне гульнёвых і пазнаваўчых праграм па народнай творчасці – конкурсы, віктарыны, праекты, прэзентацыі, кірмашы, аўкцыёны, тэле-гульні, ток-шоу, этнадыскатэкі, вячоркі і г. д.

Універсальнымі напрамкамі навукова-даследчай, вучэбнай і творчай дзейнасці студэнтаў, што могуць увасобіцца ў напісанне курсавых і дыпломных работ, падрыхтоўку артыкулаў і выступленняў на канферэнцыях, з’яўляюцца: вывучэнне навуковай літаратуры і друкаваных крыніц па этнапедагогіцы і народнай творчасці; навукова-даследчыя экспедыцыі па родным краі; запіс мясцовага фальклору і фатаграфаванне прадметаў матэрыяльнай культуры; збор звестак пра народных майстроў і навучанне рамёствам; збор і сістэматызацыя рэгіянальных этнапедагагічных матэрыялаў; складанне картатэкі сродкаў народнай педагогікі і г. д.

*Для гуманітарыяў, будучых настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства, беларускай (рускай, замежнай) мовы і літаратуры* гэта найперш работа са словам, гістарычным матэрыялам, фальклорам: збор і вывучэнне легенд і паданняў канкрэтнага рэгіёна, населенага пункта; складанне радаводу;

МГПУ им. И.П.Шамякина

вывучэнне выхаваўчых традыцый беларускіх магнатаў і шляхты; параўнальны аналіз педагагічных поглядаў народаў свету; збор і сістэматызацыя экспанатаў для школьнага этнаграфічнага музея (музея пад адкрытым небам, віртуальнага музея, школьнага краязнаўчага сайта); народны арнамент як архаічны культурны код беларусаў; прымаўкі і прыказкі – маральны кодэкс народа; народная лексіка і фразеалогія выхаваўчай тэматыкі; мясцовыя прозвішчы і мянушкі як паказчык пераемнасці традыцый; ужыванне ненарматыўнай і грубай лексікі: гісторыя і сучаснасць; тэма дзяцінства, традыцыйнай сям'і ў творчасці беларускіх (рускіх, савецкіх, замежных) пісьменнікаў; звычай "дзядзькаванне" ў фальклоры і літаратуры (беларускай, рускай, замежнай).

Мэтазгодны наступныя практычныя накірункі работы са студэнцкай і вучнёўскай моладдзю: арганізацыя мастацка-эстэтычнага выхавання на аснове каляндарна-абрадавага і сямейна-бытавога цыклаў фальклору; навучанне народным гульням, танцам і карагодам; арганізацыя этнадыскатэк, святочных вячорак, конкурсаў выканаўцаў народных песень і прыпевак; вывучэнне і ўзнаўленне асобных этапаў беларускага вяселля, дзе ў вобразнай форме закладваліся асновы моцнай сям'і.

Найбольш разнастайны матэрыял можа прапанаваць беларуская народная педагогіка *будучым спецыялістам у галіне дашкольнай адукацыі, лагапедам, псіхолагам, сацыяльным педагогам, настаўнікам музыкі і спеваў,* паколькі беларусы вядомы як творчы, спеўны народ, які стварыў найбагацейшы дзіцячы фальклор, накіраваны на ўсебаковае развіццё асобы з першых дзён жыцця.

Тэмамі студэнцкіх работ могуць стаць наступныя: адлюстраванне дзяцінства (сіроцтва) ў беларускіх народных казках; культ продкаў у беларускім фальклоры і ў культуры народаў свету; традыцыі сямейнага і грамадскага выхавання; асаблівасці гендэрнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы; скорагаворкі – узор народнай лагапедыі; народныя загадкі як сродак дыягностыкі, паказчык інтэлектуальнага развіцця дзіцяці; прыкметы і перасцярогі ад нараджэння дзяцей з адхіленнямі ў развіцці; народныя прыказкі і прымаўкі аб асаблівасцях гаворкі, маўлення; прыёмы догляду немаўлят; традыцыі народнай педагогікі на першым годзе жыцця дзіцяці; радзінны абрад; дзіцячыя святы і народныя святы з удзелам дзяцей; традыцыйныя пажаданні, правілы ветлівасці, патрабаванні народнага этыкету; выбар гасцінцаў для дзяцей і нагод для іх уручэння; адносіны да дзяцей малодшага ўзросту; арганізацыя сямейнага побыту; узаемаадносіны паміж бацькамі і дзецьмі, братамі і сёстрамі ў традыцыйнай беларускай сям'і; беларуская народная музыка і народныя музычныя інструменты і інш.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Для будучых псіхолагаў і педагогаў актуальны казкатэрапія, псіхалагічныя трэнінгі на аснове фальклору; складанне картатэкі (фанатэкі) твораў дзіцячага фальклору (калыханак і забаўлянак, народных гульняў і карагодаў); работа з народнай казкай, малымі жанрамі вуснай народнай творчасці: запіс, расказванне, педагагічны аналіз, драматызаванае прадстаўленне; конкурсы на лепшага выканаўцу скорагаворак, знаўцу народных прыказак і прымавак пэўнай тэматыкі (праца, сям'я); паказ загадак, казачных персанажаў, прыказак і прымавак з дапамогай мімікі і жэстаў і інш.

Што можа прапанаваць народная педагогіка, як састаўная частка традыцыйнай культуры беларусаў, *будучым настаўнікам матэматыкі, фізікі, працоўнага навучання (тэхналогіі), выкладчыкам машынабудавання, агратэхнічных, будаўнічых, эканамічных дысцыплін*?

Пры рабоце з дадзенай катэгорыяй студэнтаў мэтазгодна абапірацца на багатыя дасягненні матэрыяльнай культуры беларусаў: народная архітэктура і інтэр'ер; традыцыйныя тэхналогіі работы з дрэвам, глінай, металам; пабудова і эксплуатацыя вадзяных млыноў і ветракоў як экалагічна чыстых сродкаў атрымання энергіі; народныя рамёствы (бондарства, кавальства, ганчарства, ткацтва, стальмахоўства) і сакрэты іх перадачы і пераймання з пакалення ў пакаленне; агранамічныя веды – традыцыйныя прылады і спецыфіка земляробчай працы; асаблівасці мясцовай жывёлагадоўлі і вырабу скуры; арганізацыя агародніцтва, садаводства, пчалярства, бортніцтва, рыбалоўства, палявання і г. д. [2, с. 52–161]

У сферы духоўнай і грамадскай культуры – гэта традыцыйныя спосабы вызначэння адлегласці, часу, арыентацыі ў прасторы, вымярэнне шырыні і даўжыні; астранамічныя веды нашых продкаў, асаблівасці і практычнае прымяненне сонечнага і мясяцовага народнага календара як сукупнасці агранамічных, астранамічных і метэаралагічных ведаў; народныя загадкі і народныя задачы-загадкі як універсальны сродак разумовага развіцця і інш. [2, с. 162–338].

*Для настаўнікаў выяўленчага мастацтва і абслуговай працы* найбольшую цікавасць уяўляюць наступныя напрамкі: ткацтва і вышыўка; тэхналогія апрацоўкі і афарбоўкі тканіны; выраб і эстэтыка беларускага народнага касцюма; сімволіка і кампазіцыя народнага арнаменту; беларускі ручнік як з'ява культуры; этыка і эстэтыка традыцыйнай беларускай хаты; сямейныя святы і абрады; вясельныя традыцыі беларусаў, культура выпякання і ўпрыгожання вясельнага каравая; народная кулінарыя і этыкет; штодзённы побыт і харчаванне дзяцей у беларускай сям'і; сакрэты захавання і прыгатавання прадукцыі



МГПУ им. И.П.Шамякина

(малочнай, мясной, садавіны і гародніны); традыцыйныя жаночыя прычоскі і інш.

Народная эканоміка – гэта старадаўнія грашовыя адзінкі; гандаль і спосабы гаспадарчага ўзаемаразліку; меры вагі і аб'ёму для ўліку і захавання прадуктаў; крыніцы фарміравання і асаблівасці размеркавання сямейнага бюджэту і сродкаў існавання ва ўмовах натуральнай гаспадаркі.

*Для спецыялістаў у галінах фізічнага выхавання, біялогіі, хіміі, экалогіі* будуць цікавымі і карыснымі наступныя тэмы: традыцыі народнай медыцыны; гутаркі, сустрэчы з мясцовымі доўгажыхарамі; назіранні за надвор'ем, тэрмінамі прылёту птушак і іншымі з'явамі прыроды і параўнанне іх з рэкамендацыямі народнага календара; роля сям'і ў фізічным развіцці дзяцей; полаўзроставае выхаванне ў традыцыйнай культуры; этыка і эстэтыка роднай прыроды ў заклічках і прыгаворках; прырода роднага краю як фактар умацавання фізічнага здароўя; правядзенне народных гульняў, арганізацыя спартыўных спаборніцтваў, прымеркаваных да традыцыйных народных святаў.

Такім чынам, у беларускай народнай педагогіцы і выхаваўчых традыцыях іншых народаў свету можна знайсці адказы на самыя разнастайныя пытанні духоўнага і матэрыяльнага жыцця чалавека, традыцыйныя дыдактычныя прыёмы і тэхналогіі, што спрадвеку выкарыстоўваліся для навучання рамёствам, няспыннага працэсу пераймання вуснай народнай творчасці без магчымасці яе пісьмовай фіксацыі. І не так істотна, якую спецыяльнасць атрымлівае студэнт або магістрант, этнапедагагічная падрыхтоўка дапаможа і фізікам, і лірыкам сфарміраваць цікавасць да духоўнай і матэрыяльнай спадчыны беларускага народа, асэнсаваць сутнасць, змест і вядучыя ідэі народнага выхавання, а ў выніку лепш зразумець псіхалогію беларускага этнасу, каштоўнасныя і выхаваўчыя прыярытэты сучаснай моладзі, што абумовіць жаданне шырэй выкарыстоўваць метады, формы і сродкі беларускай народнай педагогікі на ўроках па сваёй спецыяльнасці, суадносіць яе дасягненні з рэаліямі сацыяльнага жыцця, асабістым вопытам, вучэбна-выхаваўчым працэсам.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Народная педагогика белорусов: типовая учебная программа для высших учебных заведений по специальностям профиля А Педагогика / сост. Н.В. Самусева, З.С. Курбыко, В.Н. Шураев; под общ. ред. И.И. Цыркуна. – Минск: Изд-во БГПУ, 2012. – 13 с. (Утверждена Министерством образования Республики Беларусь 5.09.2012 г.). – Регистрационный № ТД – А. 418 / тип.

МГПУ им. И.П.Шамякина

2. Машынскі, К. Усходняе Палессе / Казімір Машынскі; уклад., прадм., камент. У. Васілевіча; пер. Л. Салавей. – Мінск: Беларуская навука, 2014. – 528 с.
3. Нездемковская, Г.В. Этнопедагогика: учебное пособие для вузов / Г.В. Нездемковская. – Москва: Академический проект; Альма Матер, 2011. – 225 с.
МГПУ им. И.П.Шамякина